ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
22
кастрычніка
чацвер

№ 27 (1548)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

САРДЭЧНА ВІТАЕМ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПЛЕНУМА МАСКОЎСКАГА РК КПБ!

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

**АРГКАМІТЭТ МЖК,**

прымае заявы ад жадаючых удзельнічаць у конкурсе на права стаць кандыдатам у члены маладзёжнага жыллёвага комплексу. Апошні тэрмін падачы заяў — 27 кастрычніка (уключна). За даведкамі звяртацца ў камітэт камсамола супрацоўнікаў і выкладчыкаў (галоўны корпус, п. 306).

Ю. ПОЗНЯК.

**МЕТАДЫЧНЫ СЕМІНАР**

выкладчыкаў, якія працуюць на першых курсах савецкага і замежнага аддзяленняў, прайшоў на факультэце журналістыкі. На ім вялася размова аб арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу сярод першакурснікаў. Тэматыка выступленняў разнастайная: новы падыход да вучэбна-выхаваўчай работы, метадалагічныя асновы і адзінства тэарэтычнай і практычнай накіраванасці ў выкладанні лінгвістычных дысцыплін, сувязь тэорыі з практыкай пры вывучэнні курса «Уводзіны ў журналістыку», методыка выкладання замежных моў, асаблівасці метадычнай работы на І курсе.

А. НАРКЕВІЧ,
старшыня метадычнай камісіі факультэта журналістыкі.

**НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ЧАСОПІС**

«Экономические науки» адрасуецца выкладчыкам і студэнтам, навуковым работнікам і прапагандыстам. Цэнтральнае месца ў ім у 1988 годзе зоймуць артыкулы, прысвечаныя актуальным эканамічным праблемам.

Намечана працягваць дыскусіі аб паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу, аб тавара-грашовых адносінах пры сацыялізме, аб пераадольванні дагматызму ў палітэканоміі.

Уводзіцца спецыяльны раздзел «Эканамічная вучоба», які зацікавіць перш за ўсё прапагандыстаў і выкладчыкаў ВНУ. Студэнтам часопіс дапаможа ў падрыхтоўцы да экзаменаў і залікаў, напісанні курсавых і дыпломных праектаў, кантрольных работ па эканамічных дысцыплінах, а таксама навуковых дакладаў і рэфератаў.

С. ЯНЧАНКА,
прафесар,
член рэдкалегіі часопіса.

## ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Адбылося чарговае пасяджэнне бюро партыйнага камітэта БДУ імя У. І. Леніна. На ім разгледжана пытанне аб стане палітыка-выхаваўчай работы ў інтэрнатах і гатоўнасці іх да новага навучальнага года. Напярэдадні кампетэнтная камісія універсітэта азнаёмілася са станам выхаваўчай работы ў інтэрнатах, якая праводзіцца дэканатамі факультэтаў, грамадскімі фарміраваннямі, а таксама праверыла ступень гатоўнасці іх да засялення.

# Не адкладваючы ў доўгую скрыню

У АДПАВЕДНАСЦІ з «Асноўнымі напрамкамі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне» многія факультэты пры падтрымцы камітэта камсамола і прафкома студэнтаў універсітэта разгарнулі мэтанакіраваную работу па ўвядзенню ў інтэрнатах студэнцкага самакіравання. Яно дзейнічае ў інтэрнаце № 6 (ФПМ), паэтапна ўводзіцца ў інтэрнатах № 1 (гістфак) і № 4 (юрфак). Вядома, што самакіраванне садзейнічае разгортванню ініцыятывы і грамадска-палітычнай актыўнасці студэнцкай моладзі, якая значна знізілася ў апошнія гады.

Большасць факультэцкіх партыйных бюро фарміруюць камісіі, якія каардынуюць палітыка-выхаваўчую дзейнасць падраздзяленняў і арганізацый, займаюцца пытаннямі ўмацавання маральна-псіхалагічнага клімату, нагляднага афармлення інтэрнатаў. Значную работу ў гэтым напрамку праводзяць партыйныя бюро ФПМ, гістарычнага і хімічнага факультэтаў. У інтэрнатах № 1 і № 4 актыўна дапамагаюць створаныя з ліку пражываючых там камуністаў часовыя студэнцкія партгрупы.

Асноўную арганізацыйна-выхаваўчую работу ў інтэрнатах вядуць студэнцкія саветы. У інтэрнатах № 4, 6, 7 ужо ў пачатку навучальнага года яны разгарнулі рознабаковую дзейнасць па навядзенню санітарнага парадку, узялі кантроль над засяленнем, заняліся афармленнем інтэрнатаў да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка, арганізацыяй адпачынку. Значную дапамогу аказваюць ім кіраўніцтва студгарадка, прафком студэнтаў БДУ, студэнцкія прафсаюзныя бюро гістарычнага, хімічнага факультэтаў, факультэта радыёфізікі і электронікі, дэканаты механіка-матэматычнага, геаграфічнага, юрыдычнага, гістарычнага факультэтаў.

Аднак азнаямленне камісіі са станам выхаваўчай работы і ступенню падрыхтаванасці інтэрнатаў да засялення дапамагло выявіць шматлікія недахопы.

Заўважана, што большасць дэканатаў, партыйных бюро і камітэтаў камсамола факультэтаў недастаткова працуюць па ўвядзенню ў інтэрнатах студэнцкага самакіравання. Гэта стала галоўнай прычынай пасіўнасці значнай часткі студэнтаў у пытаннях арганізацыі адпачынку, добраўпарадкавання свайго «другога дома». Асабліва хвалюе тое, што адсутнічаюць каардынацыя дзеянняў і кантакты паміж кіраўніцтвам і грамадскімі арганізацыямі факультэтаў, чые студэнты сумесна пражываюць у адным інтэрнаце. Недастаткова ўвагі ўдзяляецца рабоце студэнцкіх саветаў. Падборам іх саставу на факультэтах, як правіла, не займаюцца, а са студсаветаў інтэрнатаў № 5 і № 7 асобныя актыўныя члены былі забраны для работы ў факультэцкіх арганізацыях. Гэта зніжае эфектыўнасць работы студсаветаў, часам зводзіць яе на нішто.

Патрэбна адзначыць, што партыйныя бюро журфака, філфака, юрфака амаль не ўдзяляюць увагі кіраўніцтву палітыка-выхаваўчай работай у інтэрнатах. Актывы інтэрнатаў чакаюць ад іх дапамогі ў афармленні месц грамадскага карыстання, але яе пакуль што няма. У сувязі з гэтым узровень нагляднай агітацыі нізкі, тэрміны святочнага афармлення да 70-годдзя Кастрычніка зацягваюцца. У інтэрнаце № 5, напрыклад, распрацаваны толькі план афармлення, а ў інтэрнаце № 3 пра гэта, напэўна, яшчэ толькі думаюць.

Камітэт камсамола універсітэта, а таксама камітэты камсамола факультэтаў самаўхіліліся ад паўсядзённай работы ў інтэрнатах. Прафком студэнтаў недастаткова кантралюе парадак засялення, мала ўлічваюцца інтарэсы студэнтаў. Тут дарэчы адзначыць, што ў васьмі інтэрнатах пражываюць 5253 чалавекі. (Яны перанаселены прыкладна на 30 працэнтаў). Крытычнае становішча склалася ў інтэрнатах № 6 і № 7. У першым з іх замест 416 чалавек жыве 720, а ў другім замест 1050 — 1550. Дарэчы, пытанні рассялення прафком не ўзгадняе з камендантамі, а дырэкцыя студгарадка не дабілася належнага кантакту ў рабоце са студсаветамі.

У многіх інтэрнатах у адным пакоі жывуць савецкія і замежныя студэнты. З-за дрэнна пастаўленага інтэрнацыянальнага выхавання (яно арыенціравана амаль выключна на замежных студэнтаў) нярэдка здараюцца канфлікты. Многія студэнты геаграфічнага, гістарычнага, хімічнага факультэтаў не разумеюць мэт і задач сумеснага пражывання ў пакоях з замежнікамі. Недастаткова

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# Не толькі для замежнікаў

ЯК ЛЕПШ за ўсё вывучаць замежную мову? Методык шмат. Вось, напрыклад, як рабіў гэта Ленін. З расказаў У. Д. Бонч-Бруевіча, маці Уладзіміра Ільіча патрабавала ў дзяцінстве ад сваіх дзяцей, каб адзін дзень яны размаўлялі з ёю і паміж сабой па-руску, другі — па-французску, трэці — па-нямецку. Гэта вельмі дапамагала. Н. К. Крупская успамінае, як Ільіч раіў сваім саратнікам займацца пераводамі.

Пра гэта і пра многае іншае з жыцця і дзейнасці правадыра і настаўніка працоўных усяго свету чытачы могуць даведацца, калі набудуць кнігу «Расказы пра Уладзіміра Ільіча Леніна». Выпушчана яна выдавецтвам «Універсітэцкае» як дапаможнік па рускай мове для студэнтаў-замежнікаў. Але таксама можа спатрэбіцца навучэнцам нацыянальных савецкіх школ.

Склала вучэбны дапаможнік старшы выкладчык кафедры рускай мовы падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян Л. А. Міцкевіч.

В. РАВІЦКІ,
загадчык кафедры рускай мовы для замежных студэнтаў.

Камсамольцы! Юнакі і дзяўчаты! Авалодвайце спадчынай вялікага Леніна! Вучыцеся працаваць высокаэфектыўна, творча, актыўна!

(З Заклікаў ЦК КПСС)







ЯКІЯ ЯНЫ, першакурснікі геафака? — намеснік дэкана І. П. Галай усміхаецца:

— Звычайныя. На бульбе зарэкамендавалі сябе добра, фізічнай работай іх не напалохаеш, а як вучоба будзе — пакажа першая сесія. Зараз яны старанна рыхтуюцца да конкурсаў першакурснікаў: мастацкай самадзейнасці і газет.

Дарэчы, першы семестр для студэнтаў заўсёды быў самым цяжкім, таму што вучоба ў школе значна адрозніваецца ад сістэмы навучання ў ВНУ. Студэнту трэба вучыцца канспектаваць, размяркоўваць свой час, працаваць рэгулярна. У школе можна было раз атрымаць адзнаку і дні тры-чатыры па гэтаму прадмету «пагультаяваць». У нас вынікі падводзіць сесія. А да яе яшчэ так далёка, мабыць, думае першакурснік, пачынаючы вучобу. І вельмі памыляецца, бо не паспее ён азірнуцца, як трэба ўжо ісці на экзамен.

Першакурснікі... Сёння яны яшчэ не надта ўпэўнены ў сабе, яшчэ не паказалі ўсіх сваіх здольнасцей, талентаў, але іх уіверсітэцкі цягнік ужо рушыў, пакаціўся: хутчэй, хутчэй. Яны ў ім паўнапраўныя пасажыры. І нам усім адказваць за іх лёс.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

# Ружовы ранак

## Конкурс працягваецца

ПАСТАЯННЫЯ чытачы газеты «Беларускі універсітэт», напэўна, памятаюць, што ў чэрвені гэтага года газета аб'явіла конкурс на лепшы верш. Паўторым коратка яго ўмовы. Для ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца маладыя паэты, якія зараз вучацца ў Белдзяржуніверсітэце, а таксама ўсе чытачы газеты. Для гэтага неабходна напісаць, хто з маладых паэтаў вам больш спадабаўся і чаму, а таксама які з прапанаваных вершаў вы лічыце найбольш цікавым. Конкурс праходзіць у некалькі тураў.

Маладыя паэты-пераможцы прымуць удзел у заключным туры на званне аўтара лепшага верша года. Прозвішчы чытачоў, удзельнікаў конкурсу, будуць апублікаваны, а іх лісты выкарыстаны ў наступных выпусках «Ружовага ранку».

А цяпер некалькі слоў пра вынікі першага тура. Больш за астатніх станоўчых водгукаў атрымалі адразу два вершы Вольгі Норынай: «Было...» і «Вернись!», а таксама хоку Міраслава Шайбака «Шклянка ля крыжа». Гэтыя тры творы будуць у заключным туры конкурсу.

У другім туры конкурсу прымаюць удзел Алег Дубадзелаў, Гі Арман Нсатунказі (Конга) і Андрэй Гуцаў, студэнты філалагічнага факультэта.

## Конкурс працягваецца

Для А. Дубадзелава і А. Гуцава сённяшнія публікацыі — дэбют у «Беларускім універсітэце». З вершамі Г. А. Нсатунказі нашы чытачы ўжо знаёмы (пераклад А. Дышлевіча). Сённяшнюю падборку малады афрыканскі паэт перакладаў з французскай мовы сам і з дапамогай сваіх сяброў і выкладчыкаў.

Алесь БАДАК,
студэнт філалагічнага
факультэта.

## Віктар КАМАЙ

Есць трапяткое адчуванне
Сваёй адзінай роднай мовы.
Яно, як з выраю вяртанне,
З чужыннай далі — нашы словы.

Так, нашы словы. Не пазбавіць
Тых слоў ад гора і сумлення,
І мала словы знаць і славіць,
І заклінаць іх, як маленне.

І мала з кніжак слоў пісання,
І кніжак тых пісання зрэдку...
Есць толькі мовы адчуванне,
Пра што нідзе не ўзяць даведку.

За нашы словы йшлі ў астрогі.
Да мовы нельга без пакуты,
Як да радзімы без дарогі,
Як без дарогі — хоць разуты.



## Алег ДУБАДЗЕЛАЎ

### ДОМА

Мякчэй няма за матчыны падушкі,
А ўжо не сплю, не сплю ў такую рань.
На тым акне ружовая герань,
Над тым акном гняздо вясёлай птушкі.
Яно было адзінае на свеце,
Як поціск рук тваіх, як твой пагляд.
Усё гэта больш не вернецца назад.
Я разумею гэта.
Толькі вецер, як апантаны, ходзіць па іржышчы
І гойдае над дахам правады,
Нібы шукае даўнія гады
Сярод забытых рэчаў на гарышчы.

## Андрэй ГУЦАЎ

### СОННАСЦЬ

Там, цераз прыцемкі доўгіх змярканняў,
Рэжучы плошчу пакосных лугоў,
Нёман плыве і плыве безустання,
Часам ныраючы ў брамы мастоў.
Дзе ён апыніцца? Гродна і Коўна,
У безлічы вёсак, такіх, як і тут...
Дзе, адкажы мне, твой клопат галоўны?
Дзе ты схаваў знак сышоўшых пакут?
Усё адыходзіць, з вадою мінае,
Цяжкае — камнем на дне шчэ ляжыць...
Выкаці ж, Нёман, Дняпро, іх аддай нам:
Тымі камнямі — нам ворагаў біць!

### НАКЦЮРН

На ўбогі край спусцелых замкаў
Сышоў халоднай ночы змрок.
Заціх цягнік дзесь на паўстанку
І цемры жах паплыў здалёк...
Спаміж багаццяў зорных даляў,
Дзе траціць сэнс з зямным хаўрус,
Чаму так Вега ўглядае
Ў твае прасторы, Беларусь?
Туман з Сажа паплыў праз дрэвы,
І Пушча ў казцы-цішы спіць.
Нясвіж заціх, заціхла Крэва,
У сне Наваградак стаіць.





## Ги Арман НСАТУНКАЗИ

* * *

К рукам,
Прикрывшим очаг от ветра,
Глаза — от страха,
Сердце — от боли,
Губы — от слов,
Сына — от смерти,
Жизнь — от насилия,
Сон — от дождя,
Цветок — от камня,
Я возвращаюсь,
Что б прислониться,
Зарыться, забыться,
Уйти с головой,
Уже ставшей седой,
К родным, незабвенным
Ладоням любимых
Маминых рук.

* * *

Этого малыша
Зовут Тумбэ.
Он сидит у крыльца,
Еще ничего не знавший в жизни.
Он умеет только смеяться,
Играть и воспринимать мир
Таким, каким он есть.
У него черная кожа,
Как у тысяч его предков,
Как у его отца,
Родившегося в свободном Конго.

Но настанет время,
И его руки станут большими,
И его глаза будут наблюдать звезды,
Чтобы узнать их жизнь.
Но настанет время,
И его пальцы станут чуткими,
Чтобы сделать кому-то операцию
Или вылечить рану.
Но настанет время,
И он уплывет к далёким странам,
Вокруг света, чтобы на вершине
Самой высокой горы
Оставить имя родины и отца,
Чтобы зажечь новую звезду
Среди тысячи зажженных звезд,
Чтобы сказать новое слово
Среди сказанных слов.
А сейчас — он малыш,
Его зовут Тумбэ
И у него только
Хватает сил жить на земле.

* * *

*Мама, родная,*
*О чем ты думаешь,*
*В грустной реке полоща бельё?*
*Сын твой вырос,*
*Но он ребенок,*
*И навсегда ребенком останется,*
*Чтобы ты смогла в одиночестве*
*Нежно погладить детскую голову.*
*Мама, родная,*
*О чем ты думаешь,*
*Глядя на небо*
*Ночью безлунною?*
*Ты не волнуйся,*
*Печаль твоя светлая*
*Даст мне силы от бед избавиться.*
*Мама, родная,*
*О чем ты думаешь?*

* * *

В жизни нет
Черновиков и попыток,
В ней — всё сразу,
И все — один раз.
Ты подумай о том,
Чтоб однажды
Не пожалеть о том,
Что когда-то
Думал, что в жизни
Всегда возможно
Все изменить или
Все поправить...

## *АТЭІЗМ, РЭЛІГІЯ, СУЧАСНАСЦЬ*

**Не так даўно мне прыйшло пісьмо з Маладзечна, аўтар якога абвінавачвае атэізм ва ўсіх бедах, якія напаткалі чалавецтва: войнах, голадзе, п'янстве... Асуджаючы мяне за адмову ад рэлігіі, ён абрушваецца на атэістаў наогул і ўрэшце сцвярджае: пакуль жыве рэлігія, жыве свет.**

**Нельга згадзіцца, быццам жыццё без рэлігіі пустое і нікчэмнае. Царква і біблія, прапаведуючы пакорлівасць і адчужэнне ад свету, не даюць дастойнага ўзору для пераймання, не вырашаюць пытання вайны і міру, не ліквідуюць праблему голаду, не паказваюць прыклад высокай маралі.**

НЯДАЎНА адзін іншаземец заявіў мне, што ён хрысціянін і верыць у бога. Але да гэтага я бачыў яго п'яным і таму спытаў: «Як можна сумясціць ужыванне спіртнога з верай у бога?» Нікольні не засаромеўшыся, ён адказаў: «Чаму мне нельга піць, калі Хрыстос сам ужываў віно?» Запярэчыць тут цяжка, таму што па бібліі і бог, і яго сын любяць віно. Можа, некаторыя веруючыя здзівяцца і не павераць мне. Але ў адным з біблейскіх тэкстаў псаломшчык, звяртаючыся да ўсявышняга, гаворыць, што віно ад бога: «Ты произращаешь траву для скота і зелень на пользу человеку, чтобы произвесть из земли пищу и вино, которое веселит сердце человека». (Псалом 103, вершы 14—15).

# ШТО ЗА ПРАРОЦТВАМІ?

У бібліі ёсць кніга прытчаў Саламонавых. У ёй змяшчаюцца дзве арыгінальныя парады. Першая з іх гаворыць: «Не будь между упивающимися вином, между пресыщающимися мясом: потому что пьяница и пресыщающийся абеднеют и сонливость оденет в рубище» (глава 23-я, вершы 20—21). Гэта парада і перасцярога багатым людзям: не п'янствуйце, інакш абяднееце. Але там жа ёсць і другая парада спецыяльна для беднякоў: «Дайте секиру погибающему и вино огорченному душой: пусть он выпьет и забудет бедность свою и не вспомнит больше о страдании своем» (глава 31-я, вершы 6—7). У дакладнай адпаведнасці з гэтым біблейскім павучаннем мільёны прыгнечаных на працягу стагоддзяў тапілі ў віне сваё гора, стараліся забыць аб сваіх пакутах, а багатыя «бліжнія» вякамі грабілі і ўцягвалі іх у бездань гора і галечы. Царква ж не ўтрымлівала і не ўтрымлівае людзей ад п'янства.

Былы веруючы Павел Косак успамінае: «Я сустракаўся з непрыстойнымі ўчынкамі з боку аднаверцаў. У Слуцкім раёне маладая баптыстка нарадзіла ад старога прапаведніка. У Мядзельскім раёне баптысты мужчыны і жанчыны пакінулі свае сем'і і сышліся паміж сабой. Значыць, вера ў бога, нават самая глыбокая, не робіць чалавека лепшым».

Не робіць гэтага і біблія. У «Слове божым» многа прыкладаў палавой разбэшчанасці і насільнага разбурэння сям'і. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова ўзяць другую кнігу царстваў.

Калі закранаць пытанне вайны і міру, то тут справы яшчэ горшыя. У другой кнізе царстваў, у 12-й главе, 29 і 31 верш чытаем: «И собрал Давид весь народ, и пошел к Равве, и воевал против нее, и взял ее... А народ, бывший в ней, он вывел и положил их под пилы, под железные молотилки, под железные топоры, и бросил их в обжигательные печи. Так он поступил со всеми городами аммонитскими».

Пасля гэтых радкоў міжволі ўспамінаецца другая сусветная вайна. Колькі слёз, гора прынеслі нашай зямлі фашысты! Аднак, як ні абсурдна, свае антычалавечыя злачынствы гітлераўцы апраўдвалі бібліяй. У гэтай сувязі варта прывесці расказ былога баптыста Ігара Карповіча: «У гады фашысцкай акупацыі на малітоўныя сходы баптыстаў у вёсцы Лахва часта прыходзіў адзін немец з нейкай ваенна-будаўнічай арганізацыі, які называў сябе баптыстам. На сходах быў ён вельмі актыўным: маліўся, спяваў, ахвотна ўступаў у размовы, ведаў добра біблію. Даводзілася і мне з ім гутарыць на розныя біблейскія тэмы.

І вось аднойчы, заўважыўшы ў яго на пальцы персцень з відарысам чалавечага чэрапа і дзвюх касцей, складзеных накрыж, я спытаў, як гэта можна сумясціць з верай у бога, з запаведдзю «не забі». І пры гэтым спаслаўся на біблію, дзе сказана, што нас, веруючых, аб'ядноўвае «адзін гасподзь, адна вера, адно хрышчэнне».

Ен паглядзеў на мяне пагардліва і гаворыць: «Вы, рускія баптысты, наіўны народ і біблію не зусім правільна разумееце. Яна дазваляе чалавеку рабіць усё: забіваць, гвалтаваць, грабіць, спальваць. Важна толькі не ўпусціць момант раскаяння. Разбойніку, павешанаму на крыжы разам з Хрыстом, як толькі ён раскаяўся перад ім у сваіх злачынствах, тут жа было даравана і яго прынялі ў царства нябеснае».

А хіба не ўзносяць богу малітвы тыя, хто аддаў загад скінуць бомбы на лівійскіх дзяцей, хто пралівае кроў у Ліване? У Злучаных Штатах прэзідэнт, перш чым заняць сваю пасаду, прысягае на вернасць богу. Пад прыкрыццём яго імені амерыканскія імперыялісты пагражаюць народам, якія хочуць самі вызначаць, як ім жыць, спрабуюць трымаць у страху ўсю планету.

Як бачым, рэлігія не збаўляе грамадства ні ад п'янства, ні ад амаральных паводзін, ні ад войнаў. Наадварот, у многіх выпадках яна насаджае і апраўдвае гэтыя страшныя заганы. Атэістычная прапаганда заклікана збавіць веруючых ад бескарысных і шкодных ілюзій на ўяўнае, райскае шчасце ў замагільным свеце. Яна дапамагае трапіўшым у рэлігійныя цянеты знайсці шчасце і сэнс у жыцці.

Я. ЧЫНІКАЙЛА,
былы прапаведнік, студэнт
універсітэта.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
22 кастрычніка 1987 г.
Зак. 1591.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.